ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.12 (3276) ● ЧАЦВЕР, 29 САКАВІКА, 2012

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**



Дыялог на роднай мове
На курсах, якія двойчы на тыдзень праходзяць у Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур у Мінску, слухачы знаёмяцца з эстонскай культурай і традыцыямі Стар. 2

Руплівец на ніве фактаў
Без архіўных адкрыццяў Віталя Скалабана немагчыма ўявіць гісторыю XX стагоддзя Стар. 3

Вясёлая талака ў Аўцюках
Пісьменнік Уладзімір Ліпскі “вывеў на арбіту” калінкавіцкія Аўцюкі: сёння вёска па праву лічыцца самай вясёлай у краіне Стар. 3

ПАДЗЕЯ

Астравы скарбаў у кніжным моры

У Апякунскі савет Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўвайшлі вядомыя сваімі дабрачыннымі справамі людзі. Якія клопаты чакаюць іх у бліжэйшы час?

Адам Мальдзіс

БЕЛТА

З кніжнымі скарбамі Нацыянальнай бібліятэкі знаёміцца дэлегацыя з Казахстана

Сёлета Нацыянальная бібліятэка Беларусі — юбіляр: ёй спаўняецца 90 гадоў. І я адчуваю сябе юбілярам, як чытач. У 1951-м, здаўшы экзамены ва ўніверсітэт, пайшоў у тагачасную Ленінку. Як вядома, той будынак, узведзены ў 1932 годзе ў стылі канструктывізму па праекце архітэктара Георгія Лаўрова, і цяпер стаіць на скрыжаванні вуліц Чырвонаармейскай і Кірава. З першага разу стаць чытачом не ўдалося, бо не было яшчэ ў мяне мінскай прапіскі. А з 52-га я ўжо туды часта наведваўся. Там пісаў кандыдацкую, доктарскую дысертацыі, удзельнічаў у многіх кнігазнаўчых канферэнцыях, друкаваўся ў бібліятэчных зборніках — прыкладам, ёсць мая работа “Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII стагоддзі” (1974).

А нядаўна мяне запрасілі на першае, арганізацыйнае пасяджэнне Апякунскага савета Дзяржаўнай установы “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”. Усе ведаюць, што апошніх пяць гадоў месціцца яна ў суперсучасным “брыльянце” па праспекце Незалежнасці. З цікавасцю прыглядаюся да знаёмых і незнаёмых аблічаў. Вось Павел Бачароў, дырэктар “Брытыш-Эмерыкэн Тобака Трэйдынг Компані”. За сродкі гэтай фірмы не раз закупляліся для бібліятэкі рарытэты на аўкцыёнах, аб чым пісала і наша газета. А там Аляксандр Швец — кіраўнік прадстаўніцтва ў Беларусі фірмы “Xerox Limited” (Вялікабрытанія) і адначасова старшыня “Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі”. Побач са мной аказалася дырэктар кандытарскай фірмы “Слодыч” Таццяна Селіх, якую потым, на неафіцыйнай частцы, усе мы дружна ахрысцім “самай салодкай жанчынай у Мінску, а, можа, і ў Беларусі”. У Апякунскі савет запрошаны старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны, дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Валерый Цапкала, гендырэктар холдынга “Трайпл” Юрый Чыж, першы намеснік старшыні Праўлення Нацбанка Беларусі Юрый Алымаў, старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, гендырэктар Нацыянальнай авіякампаніі “Белавія” Анатоль Гусараў і іншыя вядомыя ў краіне асобы. Прычым яны яўна ганарацца сваім новым найменнем: ме-цэ-на-ты!

Як і належыць, уступнае слова на пасяджэнні робіць дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі — доктар педагагічных навук Раман Матульскі. Спачатку ён сцісла характарызуе зборы бібліятэкі. Факты красамоўныя. У галоўным універсальным навуковым кнігасховішчы краіны сёння ёсць звыш 9 мільёнаў друкаваных дакументаў на 50 мовах свету, 137 базаў дадзеных. У 20 чытальных залах (мой любімы — даведачны) абслугоўваюцца звыш 150 тысяч сталых наведвальнікаў. А на інтэрнэт-партал бібліятэкі за год заглядвае звыш двух мільёнаў асоб.

Потым мы пазнаёміліся з палажэннем пра Апякунскі савет, прынялі яго. Выбралі на бліжэйшыя пяць гадоў старшыню — Аляксандра Швяца. Нам прапанавана насычаная праграма дзеянняў на бягучы год, на экране былі бачны і асноўныя кірункі руху. → Стар. 3

СУПОЛКА: АЗБУКА ПОСПЕХУ

Досвед, карысны для дзеянняў

Беларусы з Кішынёва вызначыліся, якімі сумеснымі справамі будуць займацца сёлета. А будзе іх нямала.

Іван Іванаў

На Беларускім падворку пад час этнакультурнага фэста ў Кішынёве

Нічога арыгінальнага, вядома ж, няма ў тым, што грамадскія суполкі робяць планы работы на бліжэйшы час, заглядваюць у перспектыву. Некаторыя, аднак, гэткую “казёншчыну” ігнаруюць. І дарма! Бо, пагадзіцеся, нават у звычайнай вандроўцы з “картай маршрута” рухацца больш камфортна. І актывісты Беларускай абшчыны ў Малдове зусім не баяцца, што іх нехта папракне ў заарганізаванасці. Нядаўна іх лідар Юрый Статкевіч даслаў у рэдакцыю цэлы “План асноўных мерапрыемстваў на 2012 год”. Давайце прыгледзімся, на што скіроўваюць намаганні нашы суайчыннікі, — магчыма, іх досвед будзе карысным і для іншых.

У студзені, як і планавалася, прайшоў справаздачны сход суполкі, а пасяджэнні савета абшчыны праводзяцца кожную першую нядзелю месяца. Тры ўрачыстыя сходы — з нагоды старога Новага года, Дня абаронцаў Айчыны і Дня жанчын — праведзены ўжо, запланаваны ўрачыстасці на Дзень Перамогі і ў гонар Дня незалежнасці Беларусі. Пяць фэстаў і конкурсаў вызначылі як вартыя ўвагі і ўдзелу беларусы з Кішынёва. У Малдове гэта музычна-фальклорны “Мэрцішор”, майскія Дні славянскага пісьменства і культуры, вераснёўскі 12-ы Этнакультурны фестываль. І на Бацькаўшчыну землякі прыедуць — каб паўдзельнічаць у Міжнароднай канферэнцыі па экалогіі (пры падтрымцы Акадэміі навук Малдовы) ды ў Міжнародным фестывалі мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

Суайчыннікі, як бачна, уважліва сочаць за юбілейнымі датамі з жыцця класікаў літаратуры і культуры. Сёлетнія чытанні, вечарыны будуць прысвечаны 130-м угодкам Янкі Купалы і Якуба Коласа. → Стар. 2

СУПОЛЬНАСЦЬ

Дыялог на роднай мове

На курсах, якія двойчы на тыдзень праходзяць у Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур у Мінску, слухачы знаёмяцца з эстонскай культурай і традыцыямі

Кацярына Мядзведская

Адна з любімых вучаніц выкладчыцы курсаў эстонскай мовы Лэйлі Свіцінай — Алеся Маунглус. Дзяўчына некалькі год наведвала заняткі ў Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур, вывучала эстонскую з самых азоў, змагла паступіць у лінгвістычны ўніверсітэт у Таліне. Паспяхова закончыўшы аддзяленне раманскіх моў, цяпер жыве ў Іспаніі. Аднак сувязі з настаўніцай не страціла. Калі бывае ў Мінску, абавязкова завітвае да Лэйлі Тынісаўны.

Сёння на курсах займаюцца як школьнікі, так і дарослыя. "Дзіма, Улад, Артур, — пералічвае вучняў Лэйлі Свіціна. — Ва ўсіх гэтых хлопцаў ёсць эстонскія родавыя карані". А настаўніца матэматыкі Нэйлі Мерсалібава беларуска, але замужам за эстонцам. На курсы жанчына пайшла для таго, каб вывучыць родную мову мужа, лепш разумець культуру народа, яго звычаі.

На занятках шмат гаворыцца пра Эстонію. "Мы заўсёды дзелімся ўражаннямі ад паездак на Радзіму, — удакладняе Лэйлі Свіціна. — Расказваем пра людзей, гарады, нацыянальную кухню, святы". Дарэчы, пад час урокаў навучэнцы згадваюць і стравы, якімі частавалі іх родныя. Вядома, што эстонская кухня славіцца разнастайнасцю малочных прадуктаў. А бульба выкарыстоўваецца, як ні дзіўна, і ў кандытарскіх вырабах.

КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

На ўроках эстонскай мовы вучні даведваюцца шмат новага пра культуру і традыцыі прыбалтыйскай краіны

Абавязкова згадваюцца ў школе і нацыянальныя святы. Так, тэматычныя ўрокі праводзяцца да Дня Незалежнасці Эстоніі (24 лютага), Дзён маці (у маі) і бацькі. Аднак самым вялікім лічыцца Нараджэнне Хрыстова, якое адзначаецца толькі ў сямейным коле. "Паводле традыцыі, трэба наведаць магілкі родных або хаця б згадаць іх хвілінай маўчання", — расказвае Лэйлі Тынісаўна.

Цікава, сама Лэйлі Свіціна ўжо больш за трыццаць год жыве ў Беларусі, прыехала сюды ў 1981 годзе разам з мужам. Аднак захавала і мову, і любоў да роднай краіны. "У свой час я закончыла Талінскі політэхнічны інстытут, — згадвае выкладчыца. — Але заўсёды вельмі беражліва ставілася да мовы. Шмат чытала, прычым не забывалася на класічную літаратуру. Супрацоўнічала з эстонскім консульствам: перакладала афіцыйныя дакументы. А яшчэ — заўсёды ўважліва праглядвала эстонскія газеты і часопісы. Цяпер з задавальненнем перадаю веды маладым. Спадзяюся, яны ім спатрэбяцца".

Ведаць іншую мову нікому не пашкодзіць, асабліва калі гэта мова бацькоў. Дзіма Ануфрыеў прызнаецца: "Пайсці на курсы мне прапанаваў тата. Ды і я сам быў не супраць — хацелася больш даведацца пра яго Радзіму, пра тыя мясціны, дзе ён нарадзіўся і вырас. Тым больш што кожнае лета мы ездзім у Эстонію да бабулі. І так добра размаўляць з роднымі на іх мове... І хоць яны ўсе гавораць па-руску, адчуваю: дзякуючы мове мы становімся яшчэ больш блізкімі".

СУПОЛКА: АЗБУКА ПОСПЕХУ

Досвед, карысны для дзеянняў

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Дарэчы, абшчына выступіла ініцыятарам таго, каб устанавіць помнік песнярам у Кішынёве, і цяпер вядзе ў гэтым кірунку неабходныя захады. Адзначаць у Кішынёве 100-гадовы юбілей Максіма Танка, 125-годдзе Марка Шагала і 90-годдзе мастака Міхаіла Савіцкага, а таксама 1150-годдзе Полацка.

Асобныя радкі ў плане прысвечаны падрыхтоўцы і адкрыццю ў Малдове Беларускага культурнага цэнтра. Трэба яшчэ знайсці крыніцы яго фінансавання, зрабіць рамонт у памяшканнях і належным чынам іх аформіць, закупіць мэблю — карацей, працы нямала. Гэта адзін з клопатаў савета абшчыны. Не застаецца па-за ўвагай і падрыхтоўка да выдання зборніка вершаў паэтаў суполкі. Дарэчы, пры ёй па-ранейшаму працуе паэтычны гурток. А для тых землякоў, якім патрэбна падтрымка, сацыяльны сектар суполкі і старасты з абласцей плануюць аказваць шэфскую дапамогу пад дэвізам "Дом без адзіноты".

Як заўсёды, актыў абшчыны будзе ўдзельнічаць у розных сустрэчах з дэлегацыямі з Беларусі, у мерапрыемствах, якія ладзяць улады Малдовы, Кішынёва, розных этнасуполак краіны. Прадоўжыцца беларуская традыцыя святкавання Гукання вясны, Купалля, Дзядоў, Калядаў, з паглыбленнем у іх прыхаваны сэнс. Гэта, як і арганізацыя дзіцячага фальклорнага ансамбля, — клопаты маладзёжна-культурнага сектара суполкі. Актыў навукова-вучэбнага сектара, як бачна з плана, збірае матэрыялы пра беларусаў, якія жывуць у Малдове і ўнеслі значны ўклад у развіццё яе навукі, культуры. Мяркуецца, будуць умацоўвацца сувязі нашых землякоў з акадэмічнымі асяродкамі Беларусі і Малдовы, Славянскім універсітэтам Малдовы, у планах і ўдзел у розных навукова-культурных канферэнцыях і семінарах.

Летась наша газета пісала, што ў Кішынёве адкрылася "Нядзельная школа беларускай мовы і культуры Беларусі", наведваць заняткі ў якой могуць не толькі дзеці, але і дарослыя. Цяпер навучальны працэс адладжваецца, і ў плане на год пазначана: прадоўжыць удасканальванне арганізацыйнай і навучальнай работы. Як важны кірунак працы актыў пазначае "ўмацаванне супрацоўніцтва з беларускімі і малдаўскімі СМІ", падрыхтоўку для іх артыкулаў. У планах удзел у Дні беларускай пісьменнасці — ён пройдзе сёлета ў верасні ў Глыбокім, на Віцебшчыне, — і ў мерапрыемствах з нагоды 20-годдзя ўстанаўлення дыпадносін паміж Беларуссю і Малдовай. Магчыма, да тых урачыстасцяў будзе створаны і нацыянальны вакальны хор абшчыны — гэтая работа ўжо распачата.

Кіраўнік Беларускай абшчыны ў Малдове Ю. Статкевіч сустракае гасцей

План, як бачым, рознабаковы. Хочацца яшчэ параіць, каб нашы суайчыннікі з Малдовы сёлета пашукалі сабе партнёраў у Беларусі. Гэта можа быць, напрыклад, адзін з раёнаў, з якім можна заключыць дагавор аб супрацоўніцтве. Жывая сувязь з Бацькаўшчынай прынясе карысць абодвум бакам — як беларускаму рэгіёну, так і суполцы суайчыннікаў у замежжы. Як гэта зрабіць? Тое ведаюць, напрыклад, беларусы паволжскага горада Тальяці, у якіх з землякамі з Ваўкавыска шмат цікавых сумесных праектаў. У тым ліку і на гэты год.

ВЕСТКІ

Цераз мяжу — без візаў

Максім Яцковіч

Паводле міжурадавага пагаднення паміж Беларуссю і Латвіяй, жыхары прымежных 50-кіламетровых зон пачалі ўязджаць у суседнюю краіну без віз

Інфармацыя пра тое, што "дадзены старт мясцовым прыгранічным перамяшчэнням паміж суседнімі краінамі", з'явілася на сайце Дзяржпагранкамітэта Беларусі на пачатку лютага. Цяпер усё больш грамадзян на сабе апрабоўваюць новыя правілы перасячэння беларуска-латвійскай мяжы ў безвізавым рэжыме. Такая выгода, аднак, даступная толькі жыхарам прымежных тэрыторый абедзвюх краін.

Варта нагадаць, што адпаведнае Міжурадавае пагадненне падпісана ў Рызе ў жніўні 2010 года. А ў канцы мінулага года ў Віцебскім аблвыканкаме бакі абмяняліся пісьмовымі паведамленнямі пра выкананне Беларуссю і Латвіяй унутрыдзяржаўных працэдур, якія неабходны, каб дакумент уступіў у сілу. Тады ж мясцовыя ўлады пачалі складаць спісы жыхароў прымежных тэрыторый, якія маюць права на перасячэнне мяжы ў спрошчаным рэжыме. "Дазволы будуць выдавацца на падставе спісаў жыхароў прыгранічных тэрыторый: для Беларусі — у генконсульстве ў Даўгаўпілсе, для Латвіі — у консульстве ў Віцебску", — інфармаваў грамадзян Беларусі Дзяржпагранкамітэт.

Дарэчы, для інфармавання насельніцтва працуе і спецыяльны інтэрнэт-рэсурс www.traffic.gpk.gov.by. Там можна знайсці як асноўныя паняцці пра малы памежны рух, так і пералік дакументаў, неабходных для перасячэння мяжы, і шэраг іншых матэрыялаў.

Віртуальныя вандроўкі

Андрэй Асфура

Трохмерныя туры па беларускіх славутасцях з'явіліся ў Інтэрнэце

Пакуль віртуальныя туры праводзяцца па васьмі славутасцях: гэта Нясвіжскі замак, Мірскі замак, спарткомплекс "Мінск-Арэна", Нацыянальная бібліятэка, сталічны цырк, плошча Перамогі, Прывакзальная плошча і вуліца Леніна ў Мінску. У прыватнасці, пад час 3D-экскурсіі па Нясвіжскім замку можна разгледзець паляўнічую, залатую і бальную залы, "наведаць" бібліятэку, замкавую плошчу і бастыён.

Панарамы размешчаны на сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме. Гэта якасныя фатаграфіі, якія дазваляюць разгледзець найменшыя дэталі, а таксама перайсці да іншага аб'екта, у іншае памяшканне. Толькі ў турах па вуліцы Леніна і Прывакзальнай плошчы такіх пераходаў няма.

Руплівец на ніве фактаў

Без архіўных адкрыццяў Віталя Скалабана немагчыма ўявіць гісторыю XX стагоддзя

Віктар Корбут

Яго няма, а кнігі гісторыка выходзяць — значыць, справы Віталя Скалабана абганялі час. Ён шукаў і знаходзіў раней невядомыя дакументы і, як кажуць даследчыкі, уводзіў іх у навуковы ўжытак.

Неяк, наведваючы Віталя Уладзіміравіча ў яго кабінеце (яшчэ ў старым будынку Нацыянальнага архіва, што на вуліцы Кірава ў Мінску), я даўся дзіву, колькі на стале (і, вобразна кажучы, "пад сталом") ляжала ў спадара Скалабана папак з падборам дакументаў пра розных дзеячаў нашай гісторыі мінулага стагоддзя.

Сёння ж я хачу сказаць колькі слоў пра Скалабана як пра чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў гістарычнай навуцы, раскрыццю праўды.

Захапляючыся кругаглядам Віталя Уладзіміравіча, я спачатку яго дапякаў (а мо нават і ўпікаў): "Чаму ж вы, спадар Скалабан, не выдасце сваіх кніг?" І раптам кнігі, зборнікі дакументаў Скалабана ў апошнія гады сталі выходзіць! Магчыма, чытачы нават і не заўважаць пад вокладкамі імя ўкладальніка. Так, напрыклад, гісторык спрычыніўся да публікацыі мноства раней невядомых дакументаў пра Янку Купалу ў Поўным зборы твораў паэта (тамы 8-9, Мінск, 2002-2003). Але не памятаю, каб ён тым хваліўся. Неспадзяванкаю для мяне сталі і складзеныя Віталем Уладзіміравічам разам з Вячаславам Селяменевым кнігі з дакументамі "Купала і Колас, вы нас гадавалі". Усяго іх мае быць тры.

Нядаўна ж у кнігарні ўбачыў яшчэ адну "цагліну", якая выйшла з творчай "печы" Скалабана (над кнігай разам з ім увіхаўся гэткі ж руплівы архівіст Мікалай Токараў) — зборнік дакументаў і матэрыялаў "Інстытут беларускай культуры. 1922—1928".

Адзіная вядомая мне кніга, дзе імя Скалабана вынесена на вокладку, — "Время и бремя архивов и имен" (Мінск, 2009). Тут сабраныя пад адной вокладкай нарысы пра літаратараў паводле архіўных дакументаў, надрукаваныя разам з Людмілай Рублеўскай у газеце "Советская Белоруссия". Налічваецца з паўсотні артыкулаў, напісаных Скалабанам разам з журналістамі "СБ", у тым ліку з аўтарам гэтых радкоў. Артыкулы пра невядомыя старонкі Вялікай Айчыннай вайны, таямніцы жыццяпісаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Максіма Танка, такіх супярэчлівых асоб, як Лаўрэнцій Цанава, Лукаш Бэндэ, пра лёс Крыжа Ефрасінні Полацкай папулярызавалі тую інфармацыю, якая раней была даступная толькі лічаным супрацоўнікам Нацыянальнага архіва Беларусі.

Спадар Скалабан на першай кнізе зборніка "Купала і Колас, вы нас гадавалі" пакінуў асабліва дарагі мне аўтограф: "Шаноўнаму Віктару Корбуту — на ўспамін пра сустрэчы ў Кульку і "СБ" — шчыра Віт. Скалабан. 11.10.2010". Калі ж я вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце культуры ("Кульку") і хадзіў на лекцыі Скалабана, то не мог і здагадвацца-марыць, што выкладчык стане маім калегам. І настаўнікам — чалавекам, які правільна зарыентаваў у гістарычнай навуцы.

З таго часу я жыву "паводле Скалабана" — можна сказаць, яго вачыма гляджу на кожнае новае гістарычнае даследаванне, гэтак жа крытычна стаўлюся да новых "фактаў", якія з'яўляюцца ў кнігах, газетах пра падзеі мінуўшчыны. Бо, як вучыў Віталь Уладзіміравіч на лекцыях па архіўнай справе, аснова асноў гісторыі — дакумент. І ён прыносіў нам на лекцыі гэтыя дакументы. Не толькі копіі з Нацыянальнага архіва, дзе працаваў і меў доступ нават да папер з грыфам "Зусім сакрэтна". Ён насіў "каштоўныя паперы" ў галаве. І без спасылкі на фонды, вопісы, справы і аркушы Скалабану можна было верыць: ён цытуе дакладна.

ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

Заглядваючы ў мінулае, гісторык Віталь Скалабан дбаў пра будучыню

Скалабан, праўда, любіў недагаворваць: пачне пра нешта расказваць і раптам змоўкне. Ніколі не казаў лішняга. І выказваў толькі тыя меркаванні, у якіх быў упэўнены на 100 працэнтаў. Скалабан знаёміў з фактамі. А высновы мусіў рабіць чытач.

Я спадзяюся, што знойдуцца паслядоўнікі, якія працягнуць справу навукоўца. Мяркую, варты гэты чалавек і таго, каб у будынку Нацыянальнай бібліятэкі, дзе цяпер месціцца Нацыянальны архіў, з'явілася мемарыяльная дошка ў памяць Віталя Уладзіміравіча Скалабана. Гэта можа і мусіць зрабіць грамадскасць у памяць пра выдатнага даследчыка. Аднаго з тых, хто вяртаў нам гістарычную памяць.

ПАДЗЕЯ

Астравы скарбаў у кніжным моры

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Добрых спраў, якімі займецца савет у Год Кнігі, нямала. Гэта найперш папаўненне калекцый рэдкіх, старадрукаваных і рукапісных кніг, звязаных з Беларуссю. Некаторыя з іх ужо выяўлены ў антыкварных магазінах або выстаўлены на аўкцыёнах. Спіс з дзесяці "кніжных помнікаў, якія адсутнічаюць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і краіне", з указаннем іх прыблізнай цаны ўручаны нам для азнаямлення. Думаю, усім будзе цікава даведацца, што і колькі каштуе. Пад нумарам 1 — "Статут Вялікага княства Літоўскага" (Вільня: Мамонічы, 1588) цаной у 45 тысяч долараў. За ім ідуць падручнік па артылерыі і феерверках нашага суродзіча Казіміра Семяновіча (Амстэрдам, 1651) за 15 тысяч еўра, размаляваны ад рукі краявід Гродна (Кёльн, 1575), ацэнены ў 1200 долараў, магілёўскае выданне 1702 года "Жыццяў святых" Дзмітрыя Растоўскага (2 000 долараў) і гэтак далей. Пішучы гэта, спадзяюся, што і ад нашых суайчыннікаў за мяжой паступяць прапановы.

БЕЛТА

Каштоўнасць старых выданняў з цягам часу толькі павялічваецца

Сярод праектаў прадугледжана набыццё мецэнатамі калекцый лепшых кніг Беларусі 2011 года для бібліятэк горада Нясвіжа, цяперашняй культурнай сталіцы краіны, выданне фотаальбома "Кніжныя помнікі Беларусі", стварэнне скульптурнай кампазіцыі, прысвечанай кнізе і чытанню. Апошні пункт, дарэчы, выклікае немалую дыскусію. Дакідваю ў вогнішча сваё "паленца": гэта, як мне падаецца, павінна быць не проста кніга як такая, а, скажам, Купалінка за чытаннем. І размясціць яе трэба ў абсягу Скарыны, які цвёрда стаў, таксама з кнігай, ля цэнтральнага ўваходу ў бібліятэку. Прыгадваю, як мы ў свой час змагаліся, каб паставіць яго каля АН БССР. Сёння ж відавочна: беларускаму і ўсходнеславянскаму першадрукару тут намнога прасторней. Ён вітае высокіх гасцей у час міжнародных форумаў, шматлікіх экскурсантаў, якія ўзнімаюцца на верх будынка.

На пасяджэнні я яшчэ гаварыў пра тое, што задача мецэнатаў — не толькі набываць кнігі, але і шукаць тыя з іх, якія лічацца загінулымі. Скажам, "Скрыпачку беларускую" Францішка Багушэвіча. Яна, паводле гістарычных звестак, была выдадзена ў Прусіі "з партрэтам аўтара" (такой дэталі не прыдумаеш спецыяльна) і канфіскавана на граніцы (у былога прафесара Беларускага дзяржуніверсітэта Міхайлы Піятуховіча, кажуць, быў адзін такі экземпляр). Варта пашукаць і "няўлоўную" кнігу Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, выдадзеную пасля паўстання 1863 года ў Бельгіі. А найперш — адсутныя сёння кнігі Скарынавага перакладу Бібліі, выдадзеныя ў Празе паміж 1517 і 1520 гадамі. Мяркуючы па рукапісных спісах, іх было куды больш, чым 22. Ну, і, вядома ж, трэба было б набыць для бібліятэкі, нягледзячы на высокую цану, экземпляр "Малой падарожнай кніжкі": яе мне пашчасціла летам мінулага года трымаць у руках у Мінску. Не забудзем, што сёлета якраз 490 год з часу выдання ў Вільні гэтага першага друкаванага помніка на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

…Калі я выйшаў з Нацыянальнай бібліятэкі на плошчу перад ёй, мне здалося ці толькі прымроілася, што Францыск Скарына задаволена вітае ўсіх. І не толькі таму, што наступіў Год Кнігі, але і таму, што ў Кнігі з'явіліся мецэнаты. Як і ў яго самога ў Празе чэшскай, а потым і ў Вільні. Мы і сёння добра ведаем прозвішчы тых месцічаў: Якуб Бабіч, Багдан Онкаў, Рыгор Адвернік…

Сёлета ў Мінску з'явіліся іх пераемнікі і паслядоўнікі.

ЗЕМЛЯКІ

Вясёлая талака ў Аўцюках

Пісьменнік Уладзімір Ліпскі “вывеў на арбіту” калінкавіцкія Аўцюкі: сёння вёска па праву лічыцца самай вясёлай у краіне. Цяпер па ініцыятыве землякоў з Украіны і з дасціпнымі ідэямі спадара Ліпскага там ствараецца Сядзіба беларускага народнага гумару.

БЕЛТА

Фестываль гумару ў Аўцюках — свята вясёлых і дасціпных

Іван Ждановіч

Напярэдадні 1 красавіка варта нагадаць, што Аўцюкі з іх гарэзлівымі жыхарамі, якіх хлебам не кармі, а дай пажартаваць ды пасмяяцца, Уладзімір Ліпскі “адкрыў” яшчэ ў 1995 годзе. “Там жывуць мае землякі, бо Рэчыцкі раён Гомельшчыны, адкуль я родам, і Калінкавіцкі — побач, — згадвае ён. — Неяк паехаў у госці ды зачапіўся. Напісаў першую кнігу: “Аўцюкоўцы. Аповесць пра каласкоў і калінак, якія гаруюць і жартуюць”. Ужо пяць кніжак па Аўцюках выйшла, і “кландайк гумару” можна і глыбей, і шырэй распрацоўваць. Па сутнасці, прыадкрылася новая старонка ў нашай культуры. І нават даследчыкі народнай культуры з Нацыянальнай акадэміі навук фальклор аўцюкоўскі бяруць асобным раздзелам”.

З лёгкай рукі Уладзіміра Ліпскага вясёлая слава пра каласкоў і калінак (так называюць у Аўцюках мужчын і жанчын) здаровымі хвалямі смеху, жартаў выкацілася на ўсю краіну і за яе межы. У Аўцюках ладзілі шэсць фестываляў гумару, на чэрвень рыхтуецца і сёмы: тым апякуюцца Міністэрства культуры, мясцовыя ўлады. І Уладзімір Сцяпанавіч у меру сіл “штурхае воз клопатаў”. Можна было б, лічыць, і больш шырока аўцюкоўскі скарб выкарыстоўваць, аднак перашкаджае некаторая “местачковая неразваротлівасць”. Таму і ўсцешаны пісьменнік, што да распрацоўкі гумарыстычнага радовішча далучыліся ўкраінскія беларусы, а канкрэтна — ураджэнец Петрыкаўскага раёна, прадпрымальнік з Кіева, кіраўнік інтэрнэт-праекта Усеўкраінскага саюза беларусаў Аляксандр Драгун.

Наш зямляк даслаў у рэдакцыю прыгожыя малюнкі — на іх бачна, якой задумана “Сядзіба Каласка і Калінкі”. У Малых Аўцюках жыве яго сястра Наталля, і сядзіба — пад яе наглядам. Да хаты, купленай у вёсцы, зроблена прыбудова. Па сутнасці, як паведаміў Аляксандр Віктаравіч, узвядзенне сядзібы завяршаецца, застаецца ўпарадкаваць тэрыторыю і адладзіць механізм прыёму гасцей. Як лічыць А. Драгун, найбольш эфектыўна ўсё запрацуе, калі да праекта падключацца і раённыя арганізацыі адукацыі, культуры. Бо сядзіба задумана не толькі як месца адпачынку шматлікіх гасцей, у тым ліку і з замежжа, але і цікавы, арыгінальны культурна-асветніцкі асяродак.

Хутка ажыве аўцюкоўская “Сядзіба Каласка і Калінкі”

Як будзе выглядаць аўцюкоўская “Сядзіба Каласка і Калінкі” — тое бачна на малюнку. Паводле праекта рэканструкцыі будынак падзелены на гасцінічную і офісную часткі. І якраз жылая частка памяшканняў будзе выкарыстоўвацца, па задуме Аляксандра Драгуна і яго паплечнікаў, “як суб’ект аграэкатурызму”.

“Мы нядаўна зноў сустракаліся з Аляксандрам Віктаравічам у Аўцюках, і яшчэ раз я парадаваўся: цікавым атрымліваецца гэты беларуска-ўкраінскі праект! — усміхаецца Уладзімір Ліпскі. — А ўсміхаюся я, бо згадаў: там жа ў “пакоі Ліпскага” будзе нават “Печ Ліпскага”. Хочаш — можаш залезці на яе ды паляжаць, падрамаць, успомніць маленства. Трэба толькі купіць ды прад’явіць “духу Ліпскага”, ці “Ліпскаму-хатніку”, адпаведны білет на “цёплае месца”. Зрэшты, паколькі гэта мая печ, то магу сябрам і пратэкцыю зрабіць. Даць запіску: “Пусціце на маю печ бясплатна” — і тады вас прымуць як майго асабістага госця. Дарэчы, не сумнявайцеся: печ у хаце ў халодную пару заўсёды будзе гарачай. І гасцей там прымуць не толькі з цяплом, смачным пачастункам, але і добрымі жартамі”.

Вялікая, пад новым дахам “Сядзіба Каласка і Калінкі” пры скрыжаванні дарог упрыгожыла вёску. Здалёк бачны высокі флюгер з вясёлымі гаспадарамі. Мяркуецца, што ў “пакоі Ліпскага” размесціцца і экспазіцыя пра “гісторыю адкрыцця Аўцюкоў як радовішча гумару” і фестывалі, якія там ладзяцца. “І дэлегаты Сёмага ўсебеларускага фестывалю гумару прывязуць у Аўцюкі свае падарункі, — дадае Уладзімір Ліпскі. — Прымаюцца “на захаванне” ў “Каморы гумару” і жарты, анекдоты, смешныя гісторыі з жыцця іншых гарадоў і вёсак Беларусі. Дасылайце іх у Аўцюкі, з прыпіскай: “На сядзібу Каласка і Калінкі”.

ПРА ШТО СЛОВА ГАВОРЫЦЬ

Ад фальклору да рок-н-рола

Творчае натхненне можа прыходзіць у любую пару года, асабліва ж часта сэрца спявае ўвесну. І сёння мы згадаем некаторыя тэрміны, звязаныя з музычным мастацтвам. А дакладней — іх канчаткі ў родным склоне. Як правільна: метала або металу, рок-н-рола або рок-н-ролу, фальклора ці фальклору?

Ёсць словы, што азначаюць паняцці з розных сфер жыцця, аднак пішуцца і вымаўляюцца яны аднолькава. Гэта амонімы. Пры скланенні вельмі часта такія словы набываюць розныя канчаткі.

Возьмем, напрыклад, назоўнік **метал**, што абазначае хімічнае простае рэчыва, трывалы матэрыял. Як і іншыя “рэчыўныя словы”, у родным склоне ён набывае канчатак **–у.** Напрыклад, *выраб з каштоўнага* ***металу***. Адзін з напрамкаў сучаснай цяжкай музыкі таксама называецца *металам*. Аднак для яго ў родным склоне характэрны канчатак *–а*. Значыць, **метала, рок-н-рола**, тое ж датычыцца і найменняў іншых музычных стыляў. Зборны ж назоўнік **фальклор**, як і іншыя падобныя словы, мае ў родным склоне канчатак **–у**: *скарбы беларускага* ***фальклору***.

З назоўнікам гук падобная, хоць і не ідэнтычная, сітуацыя. Калі маюцца на ўвазе ваганні паветра, якія мы ўспрымаем слыхам, калі размова пра фізічны і музычны тэрмін, то ў родным склоне правільны канчатак **–у**: **скорасць *гуку*, тэорыя *гуку*.** Аднак у значэнні ‘найменшы членараздзельны элемент чалавечай мовы’ назоўнік **гук** набывае ў родным склоне канчатак **–а**: *галоснага або зычнага* ***гука***.

Будзьце ўважлівыя да слова і разважліва карыстайцеся моўным багаццем!

Падрыхтавала
Вераніка Бандаровіч

ТРАДЫЦЫІ

Да вясенніх карагодаў прылятаюць птушкі

Кацярына Мядзведская, Рэгіна Гамзовіч

Спрадвечная традыцыя гукання вясны жыве не толькі ў розных рэгіёнах краіны, але і далёка за межамі

Колькі год запар беларусы Прыбайкалля святкуюць “Гуканне вясны”. І сёлета дзяўчаты з Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага і маладзёжнага ансамбля “Крывічы” сабраліся на высокай гары — спявалі традыцыйныя заклічкі-вяснянкі, вадзілі карагоды, палілі вогнішча, гушкаліся на арэлях.

Чаму ж галоўнымі дзеючымі асобамі свята былі менавіта дзяўчаты? У тым і ёсць адметнасць традыцыі. Вясна некалі ўяўлялася продкам як прыгожая багіня Лада, таму і клікалі яе заўсёды толькі юныя прыгажуні і маладыя жанчыны. Яшчэ, як вядома, з надыходам вясны зямля набіраецца сілаў для будучага ўраджаю. А хто ж, як не жанчына, дорыць свету новае жыццё! Таму на вясеннім свяце ў Іркуцку хлопцы і мужчыны былі толькі гасцямі, хаця і ім адводзілася важная роля — распальваць вогнішча, удзельнічаць у гульнях, гатаваць традыцыйную для іркуцкіх беларусаў яечню.

А колькі папяровых птушак было выпушчана ў гэты дзень з узвышша, на якім праводзілася свята! І так прыгожа яны ляцелі, расправіўшы беласнежныя крылы. Птушак з тканіны “ўсаджвалі” на дрэвы, а печанымі з цеста частаваліся. Бо імкнуліся дагадзіць капрызнай прыгажуні-багіні: замест жывых птушак, якіх яшчэ мала, вырабляюцца штучныя, каб нарэшце Лада ўпэўнілася — час ёй ужо прыходзіць.

Дарэчы, ствараць птушак з цеста — вельмі пашыраная традыцыя і ў сучаснай Беларусі. Да 22 сакавіка (гэта Саракі, свята прылёту птушак і вясновага раўнадзенства) жанчыны выпякаюць жавароначкаў. Кажуць, у гэты дзень вяртаюцца з выраю сорак птушыных чародвыраяў. На Віцебшчыне вараць і сорак клёцак з макам ці грыбамі. На Случчыне жаваронкамі называюць “патапцы”, якія гаспадыні засалоджваюць і пасыпаюць макам. А на Тураўшчыне гарачых, толькі з печы, жавароначкаў ссыпаюць на тканы абрус і выносяць на вуліцу. Там печыва падкідаюць на абрусе, а дзеці з воклічамі “Жаваронкі прыляцелі!” ловяць пачастунак і тут жа яго з’ядаюць.

Сёння, на жаль, многія дзедаўскія традыцыі і прыкметы забываюцца. А свята “Гуканне вясны” працягвае жыць. І, бадай, тым яно і цікавае, што здольнае наблізіць нас да вытокаў, вырваць з абдымкаў вялікага горада і з’яднаць з прыродай. Абавязкова кожнаму варта хоць раз у жыцці пабываць на гэтай вясенняй абрадавай дзеі. І сэрцам адчуць: вясна ўжо хутка!

Заснавальнік: Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

Рэдактар Віктар Міхайлавіч Харкоў

Адрас рэдакцыі: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61. Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290 60 11

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

E–mail: golas_radzimy@tut.by

Аб’ём выдання: 1 друк. арк.

Тыраж: 1945, **Заказ:** 0375

Час падпісання ў друк: 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». *ЛП №02330/0494179 ад 3.04.2009. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск*

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках “Голасу Радзімы”, могуць не супадаць.

© “Голас Радзімы”, 2012